Цана асобнага нумару 20 гр.

Opłatę pocztową uiszczono ryczałtem.

# СЬЦЯГ ПРАЦЫ

Выходзіць два разы у тыдзень.

| Адрэс Рэдакцыі і Адміністрацыі: Вільня, Віленская вул. 12—6 (Wileńska 12. m. 6) Рэдакцыя адчынена ад 12 да 2 гадз. штодня, апрача сьвяточных дзён. Адміністр. ад 9 да 3. | Падпіска на адзін месяц з дастаўкай да хаты 1 зл. 50 гр., на 3 мес. — 4 зл., на паўгоду — 8 зл., на год — 15 зл., заграніцу ўдвая даражэй. Перамена адрэсу 30 гр. | Непрынятыя ў друк рукапісы назад не вяртаюцца. Аплата надрукаван. залежыць ад Рэдакцыі. | Цана абвестак: перад тэкстам 25 грош., сярод тэксту 20 грошы і на 4 стр. 15 грош. за радок пэтыту ў 1 шпальту. |
|---|---|---|---|

№ 8 — Вільня, Аўторак 31-га ліпня 1928 г. — Год 1

**З прычын тэхнічнага характару, гэты нумар выйшаў спозьненым на тры дні. Наступны нумар выйдзе ў павялічаным разьмеры. РЭДАКЦЫЯ.**

## Рукі і галава.

Гадоў пяць назад выйшла ў Вільні зборная кніжка пад загалоўкам: „Заходняя Беларусь“. У кніжцы гэтай, сярод іншых артыкулаў, зварачала на сябе ўвагу праца памёршага нядаўна вядомага адваката Врублеўскага, які, укрываючыся пад мянюшкай „Вароніча“, пісаў аб нацыянальным пытаньньні. А сярод думак яго асабліва цікавая была тая, што з усіх клясаў і нацыянальных групаў кожнага народу найбольш патрабуюць мець школу, кніжку, газэту і г. д. у роднай мове сваей — *народныя масы*. Чаму?— Бо, казаў аўтар, *чалавек рабочы ня мае ні часу ні магчымасьці вучыцца чужых моваў*.

Гаворачы аб культурнай працы для і сярод беларускіх сялян і работнікаў, якая, зусім натуральна, мусіць весьціся ў іх *роднай беларускай мове* — хаця-бы ўжо для ўспомненае прычыны, мы мусім зрабіць крок далей і з асаблівым націскам адзначыць, што ў гэтай працы ёсьць яшчэ і другі мамэнт: побач з пытаньнем аб *форме вонкавай* (мове) перад намі стаіць яшчэ важнейшае пытаньне аб *унутраным зьмесьце*, аб тым, якую духоўную страву дасьць гэтая праца нашаму селяніну і работніку.

Мы мусім тут рашуча заявіць, што тая духовая страва, якую сягоньня даюць народным масам прадстаўнікі буржуазнае ідэалёгіі, — гэта-ж ня спожыў для душы, а — атрута для яе. Мусім заявіць, што тая школа, у якой буржуазія прывучае дзяцей сялян і работнікаў захапляцца ўсім „панскім“ „добрародным“, чціць „вялікіх“ цароў ды каралёў, што славу прыдбалі мерай пралітай імі крыві, узьвялічваць, як найвышэйшую цноту, вернасьць „хлопа“ „свайму пану“, ды быць пакорным „волі божай“, дыктаванай ксяндзамі й папамі і маючай нібы на мэце захаваньне „вечна і непарушна“ існуючага сацыяльнага ладу й „сацыяльнае раўнавагі“, — гэта школа не для нас. Не для нас і тая кніжка ці газэта, хоць-бы і ў роднай мове, калі стараецца ўсьцішыць творчы разгон працоўных да будаваньня для сябе лепшае, новае будучыні, новага сацыяльнага ладу. *Наша* культурная праца павінна быць пранікнена другім духам, другімі ідэаламі: яна мусіць прабуджаць у нас пачуцьцё *ўласнае творчае сілы*, разьвіваць гэтую сілу, будзіць веру ў вызваленьне чалавека з усіх адвечных путаў матэрыяльнае і духовае няволі, урэшце— падгатаўляць працоўнікаў і сяброў таго *грамадзянства будучыні*, дзе ня „добрае ўраджаньне“, не матэрыяльнае багацьце, а выключна асабістыя здольнасьці і праца служыцімуць за падставу да ацэнкі людзей. Наша кніжка, наша літэратура, наша прэса — мусіць будзіць у працоўных масах перадусім веру ў сябе, бо, запраўды-ж, *толькі мы самі — шчасьця свайго кавалі*.

„Але—мо‘ хто спытаецца—ці маем мы падставы да такое веры ў сябе“. І мо‘ пакажа на ўсю веліч матар‘яльнага даробку буржуазіі — яе фабрык-палацаў, яе машынаў-волатаў, яе багатых плёнаў з нашае неўрадлівае зямлі....

Яе... Ці-ж запраўды „Яе“? Ці-ж ня нашыя рукі ўсё гэта зрабілі паняволеныя капіталам.

„Але-ж,—скажуць нам ізноў,—мала адных рук: патрэбна да ўсяго гэтага добрая галава“.

Так, патрэбна й галава. Але паўзірайцеся пільна ў вочы ўсіх гэтых інжэнераў, аграномаў і інш., што нашымі рукамі ўсё гэта багацьце й веліч буржуазіі творыць: ці не пазнаеце вы ў іх — сыноў сялян і работнікаў, толькі дабіўшыхся вышэйшае адукацыі і... паняволеных, ці—„купленых“ тым-жа капіталам.

Не. Не аб велічы буржуазіі гавораць нам гэтыя здабыткі, а аб велічы працы народнае, толькі ня вольнае, а—панявольнае... Дык ці-ж не павінна яна далей узрастаць недасяжна, калі селянін і работнік, інжэнер і аграном будуць вольнымі сябрамі вольнае грамады і для яе толькі свае творчыя сілы аддавацімуць?...

Думкі гэтыя выклікае надыход новага школьнага году. Верачы ў свае ўласныя сілы—мы павінны дабіцца сваей беларускай школы, мы павінны ізноў падаваць дэклярацыі, бо працоўная беларуская школа — залог нашае будучыні.

## „Трактат Вечнага Міру“.

Пад рашучым націскам амэрыканскай дыплёматыі—дзяржавы пачалі ўжо прысылаць у Вашынгтон сваі—больш-менш „шчырыя“ ды „прыхільныя“ адказы на прапазіцыю сэкрэтара (міністра) загран. спраў Злучаных Штатаў Кэллога—аб „скасаваньні назаўсёды вайны“, ці—аб „трактаце вечнага міру“.

Гэтая шляхотная думка прыйшла ў галаву амэрыканскаму міністру роўна год таму назад. Падкінуў думку мін. Кэллогу — на сваю галаву—сам Брыян, калі ў ліпні 1927 г. зьвярнуўся да амэрыканскага ўраду—з прапазіцыяй адмавіць трацячы сілу—з уплывам тэрміну—француска-амэрыканскі арбітражавы трактат прыязьні. Да прысланага Кэллогу праекту новага француска - амэрыканскага трактату Брыян далучыў урачыста-красамоўны ўступ, у якім—паміж Францыяй і Амэрыкай назаўсёды выключалася ўсялякая вайна.

Мін. Кэллог аж паўгоду думаў над гэтай простай, здавалася-б, прапазіцыяй Брыяна, пэўне-ж маючай толькі характэр міравой маніфэстацыі, ці добрага маральнага прыкладу для іншых: бо-ж ці можна было падумаць аб якой рэальнай магчымасьці вайны паміж Францыяй і Амэрыкай?

Урэшце амэрыканскі міністар прыслаў свой адказ на прапазіцыю францускага. Адказ гэты, а вярней: контр-прапазіцыя Кэллога—быццам пяруном ударыў у францускую дыплёматыю! Мін. Кэллог разьдзяліў у сваей контр-прапазіцыі дзьве рэчы: арбітражны трактат амэрыканска-францускі і — Брыянавы ды яго ўрачысты ўступ аб вечным міры між Францыяй і Амэрыкай, дый стварыў з апошняга—зусім новую прапазіцыю: Кэллог запрапанаваў Францыі, пашыраючы думку Брыяна,—зьвярнуцца разам — Францыі з Амэрыкай—да ўсіх вялікіх дзяржаваў, каб супольна з імі ўсімі заключыць такі трактат „вечнага міру“, які Брыян запрапанаваў толькі Амэрыцы. З ліку вялікіх дзяржаваў мін. Кэллог выключаў пакуль-што СССР, але пэўне-ж уключаў Нямеччыну, што адразу ставіла новы трактат аб міры ў пэўны канфлікт з старым міравым трактатам — Вэрсальскім.

Француская дыплёматыя, напалоханая такім неспадзеваным амэрыканскім „ударам па Вэрсальскаму Трактату“, пачала перапіску з Кэллогам, якая ідзе вось ужо другія паўгоду. Засьцярогі Брыяна — добра ведамыя ўжо ўважным чытачом беларускіх газэтаў.

Францыя не згаджалася на выключэньне ўсялякай вайны паміж вялікімі дзяржавамі, засьцерагаючы сабе права абароннай вайны,—а побач з тым засьцерагаючы нятыкальнасьць усіх гарантуючых Францыі бясьпечнасьць (і прывілеі, здабытыя ў вайне!) ужо існуючых трактатаў—Вэрсальскага і ваенных дагавораў з саюзьнікамі... Апроч таго, Францыя высунула яшчэ адну важную зьмену ў прапазіцыі Кэллога: амэрыканскі праект прапанаваў сьпярша злажыць сільнае, скансалідаванае ядро міравога трактату паміж вялікімі дзяржавамі, а толькі пасьля таго запрапанаваць і меншым — у ідэале ўсім—дзяржавам далучыцца да гатовага ды выпрабаванага ўжо трактату; Францыя-ж дамагалася, каб зараз-жа—аднačасна з вялікімі дзяржавамі — былі дапушчаны да новага трактату, як сябры-заклaдчыкі, — і меншыя дзяржавы.—Калі ня можна, каб адразу ўсе, дык прынамсь... тыя, якія — асабліва блізкія сэрцу Францыі—з пагляду на... вэрсальскае становішча і ваенныя саюзы Францыі... Такім чынам—пэўне-ж пад націскам Францыі—амэрыканскі ўрад запрасіў—„у першую чаргу“, як кажа францускі адказ, „лёкарнскія дзяржавы“, паміж якімі аказаліся аднак жа ня толькі Польшча, Чэха-Славакія і Бэльгія, але і Румынія, і Югаславія, ці—якраз—поўны камплект дзяржаваў так-зван. „францускай арыентацыі“. Кэллог сьпярша — рашуча адкінуў усе засьцярогі ды папраўкі Францыі да амэрыканскага праекту, заявіўшы ядавіта, што ён узяў цалком ды толькі пашырыў думку і фармулу, падкінутую яму самім Брыянам. Але—у выніку паўгодавай дыплёматычнай перапіскі ды заядлай дыскусіі Францыі, якая ўзяла на сябе — з маўклівай згоды Англіі, Італіі і Японіі — увесь „агонь барацьбы“ з Амэрыкай—амэрыканская дыплёматыя, быццам распачаўшы наступленьне на Вэрсальскі Трактат, фактычна ўжо ўступіла — на ўсей лініі „Вэрсальскай Эўропе“. У выніку спору—быў прыняты вельмі характэрны для „шчырасьці“ сучаснага пацыфізма вялікіх і меншых дзяржаваў гэтай Эўропы кампраміс, які ўзапраўднасьці ануляваў усялякае рэальна-праўнае значэньне гучнага амэрыканскага „трактату аб абвяшчэньні ўсялякай вайны міжнародавым праступленьнем“, пакідаючы з яго толькі неабавязваючую амаль-што ні ў чым ды нікога — чыста маральную маніфэстацыю „пацыфізму“...

Зроблены гэты „кампраміс“ вельмі „спрытным“,—каб не сказаць мацней, — спосабам,—так, што захавана і ўся афіцыяльная і маральная павага шляхотнага амэрыканскага міратворца і „нятыкальнасьць“ яго першапачатнага праекту і... пакінуты—таксама ўсе цалком папраўкі францускага контрпраекту, засьцерагаючыя ад усялякай зьмены фактычна і праўна існуючы стан рэчаў у Вэрсальскай Эўропе — так, як быццам ніякага „трактату аб вырачэньні вайны“ ніколі і не існавала...

Запраўды-ж — засьцярогі Брыяна фактычна і праўна амаль не цалком касуюць увесь праект Кэллога... Як-жа гэткі фокус зроблены? — А навошта-ж была-б на сьвеце „дыплёматыя“, каб ня гэткія штукі?!

Зроблена гэта так, што — самы праект Кэллога пакінуты без пераменаў, як „галоўны тэкст“ трактату, а ўсе засьцярогі Брыяна—таксама без пераменаў — „далучаны да трактату“—у асобным уступе „тлумачэньмі“ да тэксту. Такі ўзгоднены праект і разаслаў Кэллог запрошаным дзяржавам, у ноце 23-га чэрвеня г. г.

Такім чынам,—у выніку спрытнага дыплёматычнага кампрамісу — запраўды-ж, як быццам — па прыказцы — і ваўкі мілітарызму асталіся цэлыя ў Эўропе і авечкі пацыфізму пакінуты сытымі ў Амэрыцы!.. На што патрэбна Кэллогу „пацыфістычная страва“ апошніх, пабачым далей.

—·—

На гэткую ноту Кэллогу—23 чэрвеня—Брыян адказаў толькі што—дня 16-VII вельмі характэрнай нотай. Брыян піша, што „францускі ўрад з здаволеньнем выражае згоду“... думаеце — на праект Кэллога. — Не, — на самы тэкст трактату Брыян ужо не зьвяртае ўвагі: ён здаволены „новымі пастанаўленьнямі, зьмешчанымі ў уступе да праекту, дый „тлумачэньнямі“ трактату, задаваляючымі становішча Францыі, якая трэбавала, каб трактат не сьцясьняў ды не абмяжоўваў права і кампэтэнцыі кожнай дзяржавы, вырашыць справу самаабароны проці нападу з боку гвалтаўніка, дый каб трактат не супярэчыў пастановам статуту Лігі Нацыяў і Лёкарнскіх трактатаў у іх цэласьці“. Брыян падчырківае, што Францыя асабліва здаволена і дапушчэньнем да трактату іншых, перадусім тых, якія падпісалі „Лёкарнскія Трактаты“—бо-ж гэта, можа залішне шчыра кажа Брыян, — надае ўсяму трактату францускі характар“!! Францыя здаволена, сьцьвярджае Брыян, і тэй засьцярогай у ўступе да праекту, што — „усялякае нарушэньне трактату, хаця-б адным з падпісаўшых яго, разам звальняе ўсіх іншых ад усялякіх абавязацельстваў адносна да стараны, нарушыўшай трактат, пазбаўляючы апошнюю ўсіх дабрадзействаў трактату“..

Нота польскага ўраду, высланая мін. Кэллогу на другі дзень пасьля францускай—17 ліпня,—амаль не цалком паўтарае зьмест апошняй, дадаючы да яго толькі запэўненьне поўнай згоды польскай палітыкі міру з прынцыпамі праекту Кэллога. Пэўне-ж—падобныя адказы мін. Кэллог атрымае і ад іншых дзяржаў — ад імя якіх Брыян, як іх фактычны паўнамоцнік, вёў баявую перапіску з Кэллогам.

—·—

Нямецкі ўрад, як ведама, без засьцярогаў прыняў праект Кэллога. Але — „францускі характэр“, на які быў фактычна перароблены пачатны амэрыканскі характэр проці-ваеннага трактату, выклікаў, як сьведчыць карэсп. „К. В.“, у нямецкай (нацыяналістычнай) прэсе вялікае нездаволеньне. Нямецкая нацыянальная прэса кажа, што францускі адказ — „проста катастрафічны для Нямеччыны“, — што ён — „пераходзіць найгоршыя нямецкія спадзяваньні“. — Як тлумачэньні, далучаныя да трактату, таксама і зьмены, зробленыя ўва ўступе да праекту, даюць францускай палітыцы магчымасьць фактычна касаваць цалкам дух і літэру ўсяго міравога пачыну Амэрыкі“... „Зробленыя Францыяй зьмены ў праекце Кэллога маюць мэтай — апраўдаць згары ды ўмагчыміць фактычна ўсялякую прэвэнцыйную (папераджаючую „спадзеваны“ напад праціўніка)!... вайну, дык даюць Францыі магчымасьць весьці вайну і проці Нямеччыны — „у мэтах ды пад відам прымусовага выкананьня пастановаў Вэрсальскага Трактату“... „Апроч таго, кажа прэса нямецкіх нацыяналістаў, — адказ францускага ўраду падчырківае, што трактат Кэллога прыймаецца — на падставе існуючых у сучасны мамэнт у Эўропе тэрытарыяльна-палітычных стасункаў, што выключае такім чынам усялякі перагляд граніцаў“. Ну, можа нямецкія апазіцыйныя нацыяналісты залішне чорна рысуюць палажэньне, але, што Брыян у гэтым „францускім напрамку“ зрабіў з амэрыканскага праекту ўсё, што толькі змог, гэта — бясспрэчна!

Запраўды-ж Кэллог уступіў Брыяну ў найважнейшым пункце; — бо-ж сьпярша ён трэбаваў абвяшчэньня праступленьнем усялякай вайны, справядліва даказваючы, што ніколі ня можна адрозьніць добра зачэпную вайну ад абароннай. Другая важная ўступка Кэллога — ужо Англіі — фармулявана ім у ноце 23 чэрвеня. — Дзяржава, якая нарушыць аружным выступленьнем трактат, тым самым зараз-жа абвяшчаецца як быццам „вонках закону“—траціць усе карысьці трактату. Тады аружнае выступленьне проці такой дзяржавы іншых дзяржаваў ужо ня будзе лічыцца нарушэньнем трактату „вечнага міру“, — навет тады, калі б яно выклікала... другую сусьветную вайну!...

Але-ж ведама, як лёгка — у сучасных варунках у Эўропе — справакаваць такое аружнае выступленьне якой з зьвязаных па руках і па нагах існуючымі „міравымі трактатамі“ дзяржавы — з пераможаных у вайне, — калі зачыніць ей усялякія, прадбачаныя навет у гэтых трактатах, шляхі да перагляду гэтых забойчых для іх трактатаў...

Такім чынам, трактат Кэллога запраўды-ж ня толькі ні ў чым не зьмяняе на лепшае палажэньне ў Эўропе, але цалкам пацьвярджае ды можа ўзмацняе той вэрсальскі лад паваеннай Эўропы, які Кэллог маніўся, можа, неяк перабудаваць — на іншых, больш справядлівых прынцыпах — запраўднага міру. Трактат Кэллога ня можа ўжо перашкодзіць тасаваньню з боку сільнейшай цяпер у Эўропе групы „вэрсальскіх дзяржаваў“ усялякіх ваенна-прымусовых санкцыяў караў адносна да дзяржаваў слабейшай групы — пабітых у вайне, а трэба думаць—якраз перашкодзіць гэтаму сталаму, ня спыняючамуся ў Эўропе дагэтуль, гвалту над пераможанымі ў вайне, — меў хіба-ж на мэце амэрыканскі міністар, калі разглядаць паважна яго праект.

—·—

Ня менш характэрны адказ рыхтуецца выслаць Кэллогу англійскі ўрад. Добрым звычаем англійскі ўрад вядзе — падвойную дыплёматычную перапіску ў справе трактату: яўную і тайную. Дык цалком высьвятліць становішча Англіі — цяжка *). Аднак-

*) Адказ Англіі ўжо апублікаваны — дамо ў наступным нумары.

ня вельмі добра, што Англія — засьцерагае для сябе такія-ж выняткі ды прывілеі, якія адразу паставіла рубам для сябе і сама Амерыка: Падобна ведамай „доктрыне Монрое“, якая засьцерагае Злуч. Штатам Амэрыкі поўную свабоду ў палітыкі ў абедзьвюх Амерыках — і Англія засьцярагла сабе цэлы рад такіх „выключна-англійскіх“ пасаў на зямной кулі, дзе пануюць „выключна англійскія інтарэсы“, ды на якія ня можа пашырацца сіла новага трактату — аб „скасаваньні“ каралеўскай вайны, як прыладу дзяржаўнай палітыкі“... Калі Амэрык. Штаты асабліва выключаюць з-пад трактату Келлога — не толькі свае стасункі з Нікарагуай дый наагул усю Сярэднюю Амерыку (Канаду!), дык і Англія таксама выключае — цэлы сьцяг земель і дзяржаваў, якія прылягаюць да яе шляху ў Індыю,—як Эгіпэт, Ірак, Суэц, Арабію, Месапатамію, і Індыю і... Гэта пас — бясспрэчнай англійскай гегемоніі, на якім Англія змушана тасаваць усьцяж вайну, як сталую прыладу і спосаб яе дзяржаўнай палітыкі, і ад гэтага адмовіцца ня можа... Такім чынам Чэмберлен паразумеўся ўжо з Келлогам — аб тым, што Англія і Амерыка ўзаемна гарантуюць: — поўную і незабяспечаную міжымі „трактатамі міру“ суверэннасьць — „Англія Амерыцы ў пасе яе Панамскага і Нікарагуанскага каналаў; Амерыка Англіі — у пасе яе Суэцкага шляху да Індыі. У рэшце сьвету хай сабе пануе „мір“, але у гэтых „пасах“ — Амерыка і Англія „маюць права“ — пры існаваньні падпісанага трактату „вечнага міру“ — рабіць, што толькі захочуць: усё гэта ня будзе лічыцца вайной. — Вельмі проста!!

---

Вось у што ператварылася „шляхотная ініцыятыва“ пацыфістычнай Амерыкі, трактат вечнага міру, абвяшчаючы вайну міжнародным праступленьнем, ды забараняючы „тасаваньне вайны, як прыладу дзяржаўнай палітыкі“, будзе мець сілу... да першага ваеннага канфлікту. нясьля чаго аўтаматычна зьнікае бяз сьледу, а на яго месца зноў выйдуць на сцэну ўсе тыя ваенныя ўмовы ды саюзы, якія падзялілі Эўропу на ваенныя лагеры.

---

Амерыканскі ўрад страшэнна сьпяшыць з заключэньнем свайго міравога трактату. Келлог хоча, каб ужо ў кастрычніку (?) ўсе міністры заграм. спраў заінтэрасаваных дзяржаваў зьехаліся ў Нью-Іерк, дзе і мае адбыцца ўрачыстае падпісаньне трактату. Чаму ў кастрычніку, можа запытаецца хто.—А таму, што ў лістападзе ўжо маюць адбыцца выбары амерыканскага прэзыдэнта, на якія якраз і падрыхтаваны гэты „Трактат Келлога“, як важны выбарны казыр, павадырамі Рэспубліканскай Партыі, якая пануе цяпер у Амерыцы.

Дык вось чаму, паміж іншым, амерыканская дыплёматыя так лёгка пайшла на ўступкі з ваўкамі эўрапейскага мілітарызму — ў справе... „вечнага міру“: гэта-ж, каб у адпаведны—выбарны—час накарміць дасыту сваіх ласых на „пацыфізм“ авец-выбаршчыкаў...

---

У заключэньне надаем вязку апошніх інфармацыяў—у справе „Трактату Келлога“.

Перадусім—вельмі цікаўна адгукнулася на справу сусьветнага міравога Трактату радавая прэса. Пакуль што можам толькі падаць (паводле „ПАТ“) водгук маскоўскіх „Известий“. Орган радавага ўраду зьвяртае ўвагу на тое, што — ў сваіх засьцярогах да прапазіцыі Келлога—англійскі ўрад рашуча патрабаваў, каб СССР быў выключаны ад удзелу ў супольным трактаце міру, дый што, з свайго боку, амерыканскі ўрад — не адкінуў гэтай засьцярогі Чэмберлена!... „Гэта-ж ясна даказвае, кажа газэта, што Трактат Келлога выразна скіраваны проці радавай Расеі, дык зьяўляецца ніяболыш, як пацыфістычным жэстам, пад засонай якога будуць надалей вясьціся падрыхтаваньні новых войнаў“...

Ня высока ацэнівае гучны амерыканскі „Трактат вечна міру“ і частка чэха-славацкай прэсы.

Калі „Народні Палітыка“ піша, што Трактат Келлога, таксама, як і Жэнеўскія праекты бясьпечнасьці і разбраеньня,—атрымалі столькі ўсялякіх агаворак ды засьцярогаў з боку вялікіх дзяржаваў, што—ад яго добрага пачатнага зярня не засталося амаль што нічога...

Наадварот—„Народні Лісты“—здаволены якраз гэтымі ўсімі засьцярогамі (францускімі...), якія захавалі ўсе існуючыя гарантыі міру ў Эўропе, але не парушаюць іх, як гэта пагражала пачатная форма Трактату“...

Як ведама, чэха-славацкі ўрад 21 ліпня выразіў у ноце да Келлога сваю згоду на падпісаньне Трактату, падчыркнуўшы францускія засьцярогі. „Практычная“ англійская прэса—ўсьлед за немніш палітычна-рэальным англійскім урадам таксама зусім „цьвярова“, каб не сказаць—цынічна, ацэньвае вартасьць новага Трактату.—„Праўду кажучы, запраўдная вартасьць новага Трактату, піша адна з газэт, будзе цалком залежаць ад таго, ці міжнародавыя стасункі і падзеі будуць разьвівацца па лініі, згоднай з выкананьнем узятых на сябе дзяржавамі трактатных абавязацельстваў, ці—не“... У першым выпадку, ведама-ж—выключана цалком нарушэньне трактату міра; ў другім разе, ну, выбачайце,—сказаўшы папраўдзе: ці-ж гэты новы Трактат папярэдзіць, ці стрымае вайну? Вось гэта дык—запраўды-ж голас цьвярозай палітычнай мудрасьці — чыста англійскага тыпу!... Гэта значыць, што Трактат—вельмі добры: бо-ж, калі ня будзе вайны, само сабой, дык тады Трактат—напэўна паможа, каб войны ня было—ані!... А калі „падзеі пойдуць па лініі“, ня згоднай з выкананьнем узятых на сябе шляхотна-міратворчымі дзяржавамі абавязкаў, тады—нічога ня зробіць: проці ражна не папрэш: вайна будзе з трактатам, як і без трактату...

У такім самым духу „тлумачыў становішча англійскага ўраду“ англійскі пасол у Вашынгтоне: „ніякія трактаты ані пакты ня здолеюць стрымаць вайну, калі вялікія дзяржавы пастановяць яе распачаць“...

Англійскі міністар унутран. спраў п. Гікс, дык той навет — „робіць сваю асобную загранічную палітыку“, канкуруючы з п. Чэмберленам: ён шчыра заявіў, што Англія—ня можа і ня хоча падпісаць Трактат Келлога, калі-б зьвязваў ёй рукі наагул, калі-б яна знайшла патрэбным ваяваць!...

Як ведама, Чэмберлен аказаўся спрытней: ён і падпіша Трактат, але так, што ўсё, што казаў міп. Гікс, астанецца ў сіле.

---

Што да месца і часу падпісаньня Трактатаў, дык весткі кажуць розна.—Пярэчучы весткам нямецкай прэсы аб урачыстым падпісаньні Трактату ў Нью-Іорку — ў кастрычніку, францускія газэты кажуць, што Трактат мае быць падпісаны таксама ўрачыста—на зьезьдзе ўсіх міністраў замежных спраў у Парыжу ўжо 21 жніўня. На ўрачыстасьць мае прыехаць і сам „герой дня“—міп. Келлог.

# Гаспадарчыя гараскопы.

Пасьля гістарычнага майвага перавароту, буржуазная і гэтак званая „дэмакратычная“ прэса ў Польшчы адводзіла цэлыя старонкі сваіх часопісаў для гімну новапаўсталаму „цьвердай рукі“ ўраду, які „прышоў і магутнай рукой зразу адрадзіў зволую народную гаспадарку.

Наша радыкальная прэса ўстрымлівалася ад такіх гімнаў, ня толькі дзеля тактычных палітычных крокаў, але глыбака была пераконана ў штучнасьці гэтае гаспадарчае санацыі.

Мінула 2 з лішнім гады, — і мы можам на падставе статыстычных даных, узятых з польскае афіцыяльнае статыстыкі, апублікаваных у ўрадавай прэсе, даказаць цыфрамі праўдзівасьць нашых пагляду. Вазьмем абшарніцкае „Słowo“ за 14 і 15/VI г. г., дзе ў артыкуле „Увагі аб польскім торговым балянсе“—гэтыя цыфры красамоўна гавораць самі за сябе. Аўтар артыкулу ўсю гісторыю торговага балянсу Польшчы пасьля валютовай рэформы дзеліць на тры пэрыяды: 1) Красавік 1924 г.—жнівень 1927 г. прынёс дэфіцыт каля 750 мільёнаў залатых франкаў, што павяло за сабою валютную катастрофу і гаспадарчую дэзарганізацыю. 2) Верасень 1925 г. — красавік 1927 г., балянс торговы даў надвышкі каля 600 мільёнаў залатых франкаў, што дала магчымасьць спыніць опадак польскага злотага і заманіць амерыканскіх банкіраў улажыць свае даляры ў польскія банкі ў форме пазыкі. 3) Сучасны пэрыяд, пачынаючы з красавіка м-ца 1927 г., даў дэфіцыт каля 760 польскіх злотых.

Трэба думаць, што прадбачаны неўраджай у Польшчы ў гэтым годзе і зьмішчаныя хіжацкай гаспадаркай лясы гэту сітуацыю не палепшаць. Ужо бачым з той-жа статыстыкі, што першыя месяцы г. г. торговы балянс адным збожжам даў дэфіцыт каля 80 мільёнаў, а, па скромным аблічэньням „Słowa“, у гэтым годзе прадбачыцца перавышка прывозу над вывазам збожжа да 100 мільёнаў злотых. Думаецца, што цыфру можна павялічыць у некалькі раз.

Цяпер зьвернемся да вывазу лесу. Не сэкрэт гэта для кожнага, што дамінуючае значэньне ў торговым балянсе Польшчы ўскладалася на транспарт заграніцу лесу. Калі кінуць вокам на статыстыку, дык так паказвае, што транспарт заграніцу лесу стала ўзрастае. Вываз яго з 1922 г. па 1927 г. павялічыўся ў 7 раз. Яшчэ ў 1924 г., вываз лесу складаў 10 проц. агульнага вывазу, а ў 1927 годзе ён ужо павысіўся да 24,5 проц.

Канстатуючы гэты факт, навет „Słowo“ перапалохалася і піша: „што сягоньня праводзім у галіне лясной прадукцыі гаспадарку ў высокай ступені безгаспадарчую і хіжацкую сыстэму, што раней, ці пазьней мусіць адбіцца пенстай на народнай гаспадарцы. У галіне гэтай трэба чакаць хуткай зьмены дзяржаўнай гаспадарчай палітыкі, або па пару гадох — будзе поўнае зьнішчэньне надаючыхся да эксплёатацыі лясных абшараў і тады настане час, калі Польшча змушана будзе ўвазіць да сябе лес“.

Абмінаючы іншыя галіны народнае гаспадаркі Польшчы, да якіх вернёмся ў другі раз, паглядзім на геаграфічны кірунак фіялянтаў польскага вывазу. Усе дробныя суседнія дзяржавы, як Латвія, Эстонія, Літва і іншыя сягоньня ня могуць наладзіць з Польшчаю нармальных торговых адносінаў, або з прычын палітычных, або па няздольнасьці канкураваць там з Нямеччынай і С.С.Р.Р. Далёкія дзяржавы — Польшчы „не пад руку“. Што-ж датычыцца Нямеччыны і СССР, дык тут ня ўсё „чыста“ з палітычнага боку, а палітыка з гаспадаркай ідуць, як ведама, побач. Стаць пасрэднікам на вялікім торговым шляху паміж СССР і Зах. Эўропай, што добра адбілася-б на народнай гаспадарцы Польшчы і што магло-бы ратаваць ад гаспадарчай катастрофы — на гэта не дазваляе шмат склаўшыхся аналічнасьцяў.

Што-ж далей?

Стаць выключна індустрыяльнай дзяржавай Польшча ня можа, бо гэтаму перашкаджае геаграфічнае яе палажэньне. Зьвярнуць увагу на земляробства—гэтую сягоньня галоўную крыніцу існаваньня краю,—перашкаджае няўдалая зямельная рэформа і нізкая прадукцыйнасьць яго.

Чаму гэта?

Важную прычыну адыгрывае ў адсталасьці земляробства прымітыўныя спосабы вядзеньня сельскае гаспадаркі. На гэта буржуазнай прэсай ускладаецца ўся віна. Але цьвяроза гледзячы на справу, дык трэба прызнацца, што калі тут адсталасьць і іграе ролю, дык не галоўную. Вялізарныя абшары зямлі на так-званых Усходніх Крэсах сягоньня ляжаць пусткамі, бо ўласьнікі іх сьвядома ня прыходзяць да інтэнсыфікацыі гаспадаркі, баючыся, што прыдзе новы „непрыяцель“ для яго гаспадар і не падзякуе яму за яго „фатыгі“. Здаецца, што гэта будзе галоўнай прычынай малога поступу польскага транспарту збожжа заграніцу. Здаецца, што ніякія ўрады з самай сільнай рукой сітуацыю гэту не ратуюць, пакуль ня будзе праведзена зямельная рэформа так, як гэтага дамагаюцца масы.

# На хвабрыцы.

Гудок прагудзе—і жыцьцё абуджаецца,
Парам машыны пыхцяць...
І стукат і грукат наўкол разьлятаецца,
Хвалі ў паветра ляцяць.

Станковы работнік ля працы ўвіхаецца,
Рукі турботай гараць...
Ён працу кахае і зю стараецца
Шчасьце жыцьця здабываць.

В. Шкодзіч.

Каранова-Вастрог
7/VI-28 г.

---



# Аб гаспадарцы ў С.С.Р.Р.

СССР — як саюз рэспублік з рабоча-сялянскай уладай, дзе будуецца сацыялізм — ад самага свайго паўстаньня быў і ёсьць цэнтрам увагі ўсяго сьвету.

Пралетарыят розных нацыянальнасьцяў з найбольшай увагай сачыў за дасягненьнямі Радавага Саюзу, як у эканамічнай і нацыянальнай, так і ўнутранай і вонкавай палітыцы, пасылаючы туды адумысна выбраных дэлегатаў. Глядзеў і глядзіць ён на СССР, як на найбольшую апору ў будучыні.

Капіталісты-ж ад самага пачатку адразу ўбачылі ў ім свайго сьмяротнага ворага і ўзяліся за энэргічную акцыю, маючы на мэце задушыць СССР сьпярша фізычнай сілай, арганізоўваючы вайсковыя атрады, або падтрымоўліваючы фінансамі і амуніцыяй існуючыя контррэвалюцыйныя, як Керэнскі, Дзянікін і г. д. Калі-ж гэтая проба няўдалася, Саюз вытрымаў напор, застасаваўся другі спосаб: эканамічнае ізаляваньне (абасобленьне, адасобленьне), недапушчэньне тавараў, крэдыту і г. д. Але і гэта не памагло.

Апошнімі часамі капіталістычныя дзяржавы, на чале з Англіяй, хочуць справаваць вайну з СССР. Для гэтай мэты быў зроблены дыплёматычны разрыў Англіі з СССР, напад на консульства ў Пекіне і іншыя напады. Наскольні ўдасца гэта Англіі, будзе залежыць ад процідзеяннага руху працоўных мас.

Апроч таго, вучоным капіталістам дадзена заданьне крытыкі савецкай палітыкі і эканоміі, як найбольшае яе зьнявечваньне і перакручваньне. Выдана шмат кніжак, у якіх аб СССР кажацца, як аб „чырвоным капіталізьме і імпэрыялізьме“ і шмат іншага.

Усё-ж часамі з тых артыкулаў можна цэлкам скарыстаць. Матэрыял аб палітыцы і эканоміі ў СССР з самога СССР амаль-што не магчыма дастаць, дык трэба, што магчыма, выбраць хоць з гэтых артыкулаў.

З гэтага боку зварачвае на сябе ўвагу артыкул у манархічнай часопісі „Pro Patria“ (№ 139 з 15 чэрвеня г. г.) пад загалоўкам: „Zasady sowieckiej polityki gospodarczej“, з якога надаем некаторыя, магчымыя месцы.

„Сучасны напрамак савецкай гаспадарчай палітыкі лічыцца ад 1922 году. Быў ён папярэджаны кругабегам (пэрыядам) г. зв. ваеннага камунізму... Найважнейшыя рысы гэтага кругабегу было „ўпаньстваўленьне“ ўсялякіх прамысловых прадпрыемстваў, забарона вольнай вымены і прымусовая рэквізыцыя ўсялякіх прадуктаў“.

Потым:

„Павадыры бальшавізму, а перадусім Ленін, зразумелі, што кірунак гаспадарчай палітыкі мусіць быць зьменены“.

Ён кажа: „Мы зрабілі тую памылку, што рашылі адразу перайсьці да камуністычнай прадукцыі і камуністычнага падзелу маемасьці... Мы разьлічвалі, або лепей кажучы, мы мелі намер без здавальняючага аблічэньня ўвясьці проста шляхам дзяржаўных дэкрэтаў дзяржаўную прадукцыю і падзел тавараў спосабам камуністычным у краі дробназемляробскім“.

Гэтак паказвае Ленін на памылкі ў працы, якая вялася да гэтай пары. Дык вось ад 1922 году пачынаецца кругабег Новай Эканамічнай Палітыкі, гэтак званага Нэп'у.

З гэтай мэтай рад галін грамадскай гаспадаркі быў узяты пад дзяржаўную ўладу, з той таксама мэтай савецкая ўлада стараецца разьвіць (хіба разьвіла) кааператыўны рух, які мае, паводле тэарэтыкаў бальшавізму, тварыць неўнімы пераходны этап ад капіталізму да камунізму. Адначасна дзяржава стараецца налажыць (чытай: налажыла) сваю руку на тыя галіны гаспадарчага жыцьця, каторыя пакінута прыватнаму капіталу праз неўнуку падаткавую і крэдытавую палітыку.

Кругабег Нэп'а мае быць кругабегам прыгатаваўчым да ўвядзеньня камунізму, нае ён грамадзянства, перадусім сялянства, адпаведна выхаваць і патроху прывучыць да камуністычных парадкаў.

Чым больш гаспадарчыя варштаты, тым больш дзяржава стараецца іх захапіць. Напрыклад, усе вялікія прамысловыя прадпрыемствы зьяўляюцца, згодна з арт. 54 савецкага цывільнага кадэксу, уласнасьцю дзяржавы і трымаюцца ў аграмаднай (чытай: усёй) частцы пад яе кіраўніцтвам. Прыватны капітал да прадукцыі таксама дапушчаны. Ёсьць прадпрыемствы з капіталам мяшаным. Прыватны капіталіст у гэткіх выпадках кіруе прадпрыемствам, але пад кантролем дзяржавы (чытай: сялян і рабочых). Наагул аднак прыватны капітал адыгрывае вельмі (зусім!) ня значную ролю ў прамысловай прадукцыі. Расейскі (хіба СССР) промысел у сучасны момант ёсьць промыслам дзяржаўным (сялянска-работніцкім).

Аб вёсцы пішуць гэтак:

„Цяпер існуюць у Расеі (СССР) тры асноўныя тыпы сялянскіх гаспадарак:

1) гэтак званыя „общины“, у якіх асобны гаспадар ня мае на заўсёды выдзеленай зямлі, а падзел зямлі на асобныя гаспадаркі адбываецца што два гады.

2) адзельныя прыватн. гаспадаркі.

3) грамады-суполкі ці гэтак званы „товарищеский порядок“, якія становяць гаспадарку цэлага раду сялян. Суполкі могуць быць агранічаныя і асноўвацца на супольных сенажацях і выганах, таксама ахапліваць цэлую гаспадарку і тады яна творыць запраўдную камуну“.

Як бачым, так уся зямля ў той ці іншай форме перайшла ў рукі працоўнага сялянства.

„Далей існуюць яшчэ гаспадаркі дзяржаўныя, гэтак-званыя „Совхозы“, якія маюць быць (чытай ёсьць) неўнага роду гаспадаркамі прыкладнымі, ці то ў напрамку вырабу зямлі, ці гадоўлі быдла.

Згодна з пастановамі XV зьезду Камуністычнай Партыі, савецкая аграрная палітыка імкнецца з аднаго боку да надняцьця зямельнай прадукцыі (вырабу), з другога боку да ўвядзеньня земляробства на дарогі камунізму. Для дасягненьня першай мэты Саветы стараюцца дапамагчы сялянам у палепшаньні іх гаспадарак праз утрыманьне інструктараў-аграномаў, увядзеньне цэлага раду станцыяў для досьледаў, даваньне пазык на купляньне земляробскіх прыладаў і г. д.

Другую сваю задачу выпаўняе аграрная палітыка, перадусім стараючыся вызваліць земляробскія гаспадаркі з-пад залежнасьці іх ад прыватных купцоў і капіталістаў. Галоўнай абаронай у гэтым змаганьні зьяўляюцца кааператывы: пазыковыя і гандлёвыя. Гэтыя апошнія маюць на мэце захапіць гандаль земляробскімі прадуктамі і даставіць земляробам патрэбных ім прамысловых вырабаў.

Простая рэч, што з спэцыяльнага дагляду Савецкай ўлады карыстаюцца грамады-суполкі, але большыя гаспадары, г. зв. кулакі, мусяць дужацца з труднасьцямі ў выглядзе падаткавага ўціску, цяжкага дастаньня крэдыту і г. д. У шмат лепшым становішчы, у гэтым выпадку, знаходзяцца бяднейшыя сяляне, якія не належаць навет да грамад-суполак.

Аграмаднае значэньне прыдаюць Саветы захопленьню, як унутранага, так замежнага гандлю. Задача гэта даручана г. зв. Народнаму Камісарыяту Замежнага і Унутранага Гандлю (Наркомторг).

Замежны ганд. знацыяналізаваны ў руках дзяржавы. Імпортам і экспортам займаецца беспасрэдна Наркомторг і некаторыя ўпаважненыя да гэтага прадпрыемствы.

Замежная гандлёвая палітыка вырашана пастановамі XIV і XV зьездаў Камуністычнай партыі. Пастановы гэтыя прызнаюць абавязкавую незалежнасьць гаспадаркі Расеі (СССР) пры адначасным моцным падтрыманьні экспорту“.

Вось больш-менш тыя месцы з артыкулу, якія магчыма выкарыстаць да пазнаньня асноваў гаспадарчай палітыкі ў СССР.

# Палітычная хроніка.

## У Польшчы.

### Гданскія адносіны.

Апошнімі днямі польскі ваенны флёт павялічыўся на 2 новыя мінаносцы і 3 падводныя лодкі. З гэтай прычыны Гданская прэса выказвае зьдзіўленьне і кажа, што польскі ваенны флёт карыстаецца гданскім партом у той час, калі ў гданскай канстытуцыі запэўнена, што Гданск ня можа быць базаю для ніякага чужога флёту. Калі адзін з новазбудаваных у Францыі польскіх караблёў (ваенных), першы раз прышоў у Гданск,—дык быў абкіданы каменьнем сабраўшымся на ўзбярэжжы натаўпам. Раз разагнаны паліцыяй натоўп быў сабраўся яшчэ раз, з варожымі, проціпольскімі крыкамі і каменьнем.

### Колькі ў Польшчы сталіцаў.

Панучая ад пачатку Польшчы цэнтралізацыя дзяржаўнага жыцьця, перажывае цяпер свой крызіс, бо ў польскіх кругах пануе пераканаьне, што новая канстытуцыя Пілсудзкага прынясе ў гэтай галіне пераварот. За першыя крокі гэтай спадзяванай „дэцэнтралізацыі" ўважаецца падарожжа Прэзыдэнта Польшчы. Як ведама, Прэзыдэнт выехаў цяпер на 2 тыдні ў Пазнань, наступна паедзе ў Вільню, а потым у Кракаў. У-ва ўсіх гэтых гарадох Прэзыдэнт будзе працаваць у-ва ўсіх бягучых справах дзяржавы. З гэтага бачым, што кожны з гэтых гарадоў будзе свайго роду сталіцай. Такія паездкі маюць адбывацца кожны год.

Дык колькі-ж будзе ў Польшчы сталіцаў—адна, чатыры ці пяць (са Львовам)?

### Барацьба за родную школу.

9 ліпня г. г. адбыўся зьезд павятовых прадстаўнікоў „Просьвіт" на Валыні. Абгаварыўшы бягучыя пытаньні, зьезд аднагалосна пастанавіў рад рэзалюцый, у якіх горача пратэстуе проці ўмешваньня адміністрацыі ў унутранае жыцьцё „Просьвіты" (падпарадкаваньне апошняй адміністрацыі); проці зачыняньня павятовых „Просьвіт" разам з многімі сельскімі аддзеламі і дамагаецца неадкладнага адчыненьня зачыненых павятовых „Просьвітаў" у Дубне, Ковелі і Роўне і спыненьня ўсіх рэпрэсій адносна „просьвіцянскага" руху на Валыні.

Апрача гэтага, зьезд заклікае Валыншчыну байкатаваць „просьвіцянскія сурагаты" (падробкі), паўстаючыя ў розных мясцох паветаў, падтрымліваных мясцовай адміністрацыяй, і заклікае ўкраінскую прэсу як найбольш рэагаваць на ўсе надужыцьці адміністрацыйнай улады. („Рада" № 77).

### Выбух у фабрыцы штучных агнёў.

21 г. месяца ў Варшаве здарыўся выбух у фабрыцы штучных агнёў. Пасьледзтвы выбуху былі страшэнныя—будынак выляцеў у паветра, часткі-ж, якія асталіся, згарэлі. Людзкіх ахвяр—4 зусім згарэлі і адзін работнік моцна апараны.

### Гарнякі дамагаюцца падбаўкі.

21-га г. ліпня адбылося ў Катавіцах (Сьлёнск) пасяджаньне саюзу гарняцкіх працадаўцаў, на якім разглядалася дамаганьне гарнякамі 25-30 прац. падбаўкі. Дамаганьні работнікаў-гарнякоў адкінуты. Работнікі, ня гледзячы на гэта, асталіся пры сваіх жаданьнях.

### Гаспадарчае становішча Польшчы.

Санацыйны „Głos Prawdy" падаў у 201 нумары кароценькі агляд гаспадаркі Польшчы за мінулы месяц чэрвень, з двух толькі галінаў яе жыцьця—банкірскага і земляробскага, паясьняючы такім уступам:

„Для ўясьненьня сабе абразу нашай гаспадарчай сітуацыі, падаем ніжэй, найбольш характэрыстычныя ўступы гэтага справаздаьня".

Вось гэтыя „характэрыстычныя" ўступы тут і прыводзяцца.

„Палажэньне на грашавым рынку адзначае ў мінулым месяцы далейшае завастрэньне і вялікі голад гатовых грошай. У канцы месяца брак гатоўкі зазначыўся вельмі моцна найбольш ў вялікшых асяродках гаспадарчага жыцьця (Катавіцы, Лодзь").

З галіны земляробства падаецца (як характэрнае) наступнае: „Ня гледзячы на значную папраўу пасеваў, іх становішча горшае, чым у чэрвені мінулага году. Найлепш пасевы паправіліся ў паўднёвай і заходняй часткі краю, найгорш—у ўсходняй".

„Ураджай сена і канюшыны аказаўся наагул непамысным, пасьледствам чаго будзе недахоп корму на зіму".

„У галіне гадоўлі бідна цэны бяз паважных зьменаў. Вываз яец, дапяўшы ў траўні вялікай цыфры—10 тыс. тонаў, упаў, дзякуючы канкурэнцыі расейскага тавару,— галоўнае на нямецкім рынку".

Вось, як выглядае гаспадарчае становішча Польшчы—падае „санацыйная прэса".

Чаму-ж яна не падала „характэрнага" ня толькі з гэтых 2-ох, але і з рэшты галінаў гаспадарчага жыцьця Польшчы?

Ці там ёсьць чым пахваліцца?!

### Самасуд работнікаў.

З работнікі, працуючыя пры будове гарадзкой разьніцы ў Любліне, „датхліва" пабілі надзоршчыка і навет выклікалі вялікую авантуру.

### Зьмена міністра заграінічных спраў.

Варшаўская прэса (Rzeczpospolita № 209) падае вестку, паводле якой міністар заграінічных спраў быццам мае быць назначаны ў меўні польскім паслом у Лёндане, а на міністра заграінічных спраў будзе назначаны цяперашні польскі пасол у Маскве—Патэк.

### Пажар фабрыкі.

З няведамых прычынаў ў Лодзі згарэла фабрыка Коня і Гэнтэнбэрга. Страты вялікія. Безрабоцьце павялічана на працаваўшых там работнікаў.

### Мэталёўцы дабіліся падвышкі.

Работнікі мэталёвага промыслу ў Катавіцах дабіліся 6 проц. падвышкі, якая пачынаецца ад 1-га ліпня г. г.

### Лік безработных у Польшчы.

Па даных Дзяржаўнага Ураду Пасрэдніцтва Працы, у мінулым тыдні ў Польшчы зарэгістравана 109.536 безработных.

### Арышт камуністаў.

У Сасноўцы арыштаваны чатыры камуністы, з якіх адзін, нейкі Лепа, быццам ёсьць сябрам Цэнтральнага К-ту Саюзу Кам. Моладзі і прыехаў, як падае „Rzeczpospolita" № 211, у Сасновец (Сьлёнск) з Варшавы.

### Адабраньне паштовага дэбіту.

Міністэрства ўнутраных спраў адабрала паштовы дэбіт і забараніла распаўсюджваньне на абшарах Польшчы наступных заграінічных часопісаў: 1) „Красная Панарама" — Ленінград (парасейску), 2) „Новый Зритель"— Масква (парасейску), 3) „Дыцячы Рух"—Харкаў (паукраінску), 4) „Дэр Кустар" — Масква (пажыдоўску), 5) „Bicz Boży"—Чыкаго Амэр. (папольску), 6) „Іскра" Чэхія (пачэску), 7) „Festschrift-Deukmal"—Нямеччына (панямецку).

### Трагэдыя польскіх інвалідаў.

У доме інвалідаў у Львове мелі мейсца 2 трагічныя самазабойствы інвалідаў.

Выстралам з рэвальвэру застрэліўся аольнепшы Язэп Галічаноўскі, а пасьля тым самым рэвальвэрам застрэліўся другі інвалід, ведамы пад псэўдонімам Міська. Прычына абоіх самазабойстваў — калецтва і цяжкія варункі жыцьця.

Так падае гэтую вестку 212 нумар „Rzeczypospolitej".

## Заграніцай.

### 6-ты Кангрэс Комінтэрну.

17-га ліпня ў Маскве адбылося адчыненьне 6-га Кангрэсу Комінтэрну. На кангрэс прыехала ўсяго каля 350 дэлегатаў з 35 розных краёў. У праграму кангрэсу ўваходзяць даклады Цэнтр. Выкан. Каміт. Комінтэрну, справа „барацьбы з небясьпекай вайны", даклады аб рэвалюцыйным руху ў калёніях і г. д. У прэзыдыум кангрэсу выбраны — Бухарын, Сталін, Клара Цэткіна, Тэльман, Кашэн і 28 іншых павадыроў камуністычных партыяў розных краёў.

### Сталін — аб кангрэсе і аб неадхільнасьці вайны.

Перад кангрэсам прыехаў на кароткі час у Ленінград Сталін, які зрабіў там цікаўны даклад — аб працах кіраўніцтва Камуністычнай Партыі і аб прагграме і мэтах кангрэсу Комінтэрну.

Сталін заявіў, што паміж Радамі і капіталістычным сьветам канфлікт — неадхільны. Небясьпека новых войнаў і ваенных інтэрвэнцыяў — галоўнае пытаньне нашых дзён, казаў Сталін. Ліга Нацыяў, казаньні аб вечным міры, забароны вайны, хлусьня аб разбраеньні, — увесь гэты буржуазны пацыфізм, усё гэта—па словах Сталіна—толькі прыклад да падрыхтаваньня добрай вайны. „Есьць дурні, якія думаюць, што, калі існуе гэты „імпэрыялістычны пацыфізм, значыць ужо — канец войнам". Але-ж гэта — хлусьня; трэба сказаць — якраз наадварот: калі ёсьць гэты пацыфізм дый яшчэ з Лігай Народаў, дык напэўна будуць новыя войны. Сталін рэзка нападаў на сацыял-дэмакратыю за яе прыхільнасьць да пацыфізму.

Задачай кангрэсу Комінтэрну казаў далей Сталін, ёсьць стварэньне адзінага фронту работнікаў перадавых краёў — дзеля таго якраз, каб паняредзіць небясьпеку вайны, а калі вайна ўсё-ж выбухне, дык — каб адразу пераатварыць імпэрыялістычную вайну ў клясавую, хатнюю вайну,—зваліць усюды капіталізм ды ўстанавіць радавую ўладу.

Новая праграма Комінтэрну, казаў Сталін, мае ахапіць ня толькі цывілізаваныя нацыі, але і ўсе народы сьвету — і белыя, і каляровыя.

### Вялікія манэўры чырвонай арміі.

У канцы ліпня распачынаюцца вялікія манэўры чырвонай арміі — удоўж польскай і румынскай граніцаў. У манэўрах прымуць удзел войскі Смаленскага, Менскага, Кіеўскага і Адэскага ваенных акругоў.

Ваенная задача манэўраў—адбіць наступленьне праціўніка, які ідзе націскам на лінію Менск-Смаленск, адначасна робячы авангардам наступленьне на Кіеў.

### Урад СССР падрыхтоўвае газавую абарону краю.

З Масквы даносяць бэрлінскія крыніцы, што ў апошнія дні там адчынены асобны інстытут падрыхтаваньня хімічнай абароны.

На ўрачыстасьці адчыненьня новага інстытуту заступнік ваеннага камісара СССР сказаў прамову, высьветліўшы „значэньне новай установы, маючай на мэце абарону Радавай дзяржавы, акружанай жалезным кальцом імпэрыялістычных дзяржаваў, якія маюць мэтай адабраць ад народаў СССР вольнасьць, незалежнасьць і здабычы рэвалюцыі".

„Найважнейшае аружжа ў сучаснай вайне, гэта—самалёты і газы, а дзеля таго,—казаў ён — Рады павінны — нароўні з іншымі дзяржавамі, разьвіваць у сябе хімічную прамысловасьць".

### Рады будуюць вялікую фабрыку танкаў.

Радавы ўрад мае ў бліжэйшыя дні распачаць нарады з нямецкімі спэцыялістамі — у справе будовы вялікай фабрыкі ваенных танкаў. Фабрыка мае быць выбудавана ў адным з местаў над Волгай.

### Трывога ў Літве.

Апазіцыйныя газэты вельмі ўстрывожаны—маючымі адбыцца ў Вільні зьездам легіянераў,—з удзелам марш. Пілсудзкага, а такжа — манэўрамі польскай арміі ў Віленшчыне. Зьвязываючы ўсё гэта з падарожжамі польскіх палітыкаў у Румынію і Францыю, апазіцыйная прэса даходзіць да пераконаньня, што — над Літвой зьбіраюцца цёмныя хмары... Папярэдзіць неўхільную грозу, кажа апазіцыя, можа толькі — безадкладнае скліканьне парляманту, які адзін толькі здолее знайсьці выхад з цяжкага палажэньня.

### Пасрэдніцтва нямецкага ўраду ў Коўне.

Адна з бэрлінскіх газэт, пазываючыся і на англійскія крыніцы, падала сэнсацыйную вестку—аб тым, што нямецкі ўрад—у паразуменьні, з аднаго боку, з англійскім і французскім урадамі, а з другога,—з радавым урадам—зрабіў — праз свайго пасла ў Коўне — дыпляматычны націск на літоўскі ўрад, маючы далікатна пераканаць Вальдэмараса ў бясплоднасьці яго апорнага становішча ў польска-літоўскіх перагаворах.

Нямецкі ўрад зьвярнуў увагу Вальдэмараса на тое, што завастрэньне адносінаў з Польшчай не ляжыць у інтарэсе—ані Літвы, ані наагул—эўрапейскага міру.

### Бэльгійскі ваенны міністар—аб нямецкай арміі.

Бэльгійскі ваенны міністар заявіў у парляманьце, што нямецкая армія мае найнавейшы ваенны матар'ял і наагул — дасканала падрыхтавана. Бэльгійскі міністар ня мае ніякага сумліву, што Нямеччына робіць усе высілкі, каб давесьці якмага да вялікшай сілы свой ваенны апарат,—падрыхтоўваючы новую вайну. Дык ясна, што адсюль бэльгійскі міністар выводзіў, што—„найлепшым адказам на гэтыя нямецкія збраеньні зьяўляецца ўсіленьне баявой сілы бэльгійскай арміі"...

Але таксама разумеюць акурат усе бяз вынятку ў Эўропе—і цяпер, як і перад вайной. Дый пэўне-ж—і нямецкі міністар, даведаўшыся аб далейшым палепшаньні бэльгійскай арміі, будзе разумець таксама, як бэльгійскі. Дык — дзіва, што ўрэшце „найлепшыя ў сьвеце гарматы „пачнуць ізноў—самі самой страляць", як у 1914 г.

### Шубэртаўскія ўрачыстасьці ў Вене — трыумф справы далучэньня Аўстрыі да Нямеччыны.

Распачаўшыяся ў Вене ўрачыстасьці ў чэсьць слаўнага венскага музыканта-кампазітара Шубэрта пераатвараюцца ў сьцяг маніфэстацыяў—на карысьць злучэньня Аўстрыі з Нямеччынай...

21-га ліпня ў Вене адбыўся велізарны канцэрт нямецка-аўстрыяцкіх хораў, якія сабраліся з усіх нямецкіх земель на зьезд у Вену. У салі сабралося 90.000 публікі, а столькі-ж стаяла на вуліцы. Уся гэтая тоўпа народу ўсьцяж маніфэставала на карысьць злучэньня ўсіх нямецкіх земель у адзіную дзяржаву...

Прыехаўшы на зьезд старшыня нямецкага парляманту тав. Лёбэ — у гутарцы з карэспандэнтам дэмакратычнай венскай газэты — заявіў, што гэтыя шубэртаўскія сьвяты, маючыя выдатны агульна-нямецкі нацыянальны характар зьяўляюцца ўступам да злучэньня Аўстрыі з Нямеччынай.

У другой газэце тав. Лёбэ заявіў, што злучэньне Аўстрыі з Нямеччынай ня ёсьць справай палітычнай, але ёсьць справай усяго нямецкага народу.

Дык — чым больш робяць перашкодаў звонку дзяржавы гэтай справе, тым больш энэргічна нямецкі народ будзе ісьці да злучэньня.

### Нямецкая прэса — аб уступцы польскага ўраду — у справе сяленьня нямецкіх грамадзян на польска-нямецкім пагранічы.

Запэўненьне польскага ўраду, што ён ня будзе тасаваць да нямецкіх грамадзян ведамага дэкрэту прэзыдэнта рэспублікі, абмяжоўваючага правы нямецкіх грамадзян у прыгранічных абшарах Польшчы былога прускага забору (з-за гэтага дэкрэту якраз нямецкая дэлегацыя перарвала перагаворы), — гэтую ўступку з боку польскага ўраду — нямецкая дэмакратычная прэса прыняла вельмі прыхільна. Прэса бачыць у гэтым добрую волю польскага ўраду—у напрамку памысьнага ўзнаўленьня гаспадарчых стасункаў з Нямеччынай. Наадварот, нацыяналістычная прэса, выражаючая перадусім інтарэсы нямецкіх абшарнікаў, заінтэрэсаваных у абмяжаваньні ўвозу польскага збожжа і мяса ў Нямеччыну,—перасьцерагае ўрад, каб ня верыў на слова Польшчы. Прэса гэта радзіць

самыя перагаворы распачаць з справы пасяленьня нямецкіх грамадзян у Польшчы: тады толькі высьветліцца, ці запэўненьне польскага ўраду мае рэальны характар, ці—астанецца толькі „добрым словам на паперы".

### „Ніякага перагляду трактату!..—прызнамсь—у справе нашых граніцаў".

На адчыненьні нейкага памятніка ў Лізано (Італія) адбылася вялікая маніф. былых франтавікоў-фашыстаў, на ўрачыстасьці былі прысутны кароль з сьвітай, міністры. Адзін з міністраў—ад імя караля—сказаў „баявую прамову" — у балючай справе — тыроляскіх немцаў, з якімі фашыстаўскія арганізатары маюць ужо шмат клапотаў, а будзе — пэўне-ж—яшчэ больш... Міністар заявіў, што „паўднёвы Тыроль, на якім ужо ўзьняўся італьянскі сьцяг, будзе належыць да Італіі—на вечныя часы, дый ніколі прыналежнасьць яго Італіі ня можа быць узята пад сумліў. Італьянскі ўрад ніколі не дазволіць наагул нікому ўмешвацца ў унутраныя справы Італіі. Дык усялякі перагляд граніцаў Італіі абапертых на трактатах, выключаны цалком. А вось—перагляд чэха-славацкіх граніцаў і румынскіх Вэнгрыі,—гэта—іншая рэч!..

### „Міратворчая праца" ідзе ўсьцяж.

У апошнія дні здарыўся цэлы рад страшэнных выбухаў у фабрыках ваенных матар'ялаў розных дзяржаваў — ува Францыі (ажно 2), у Нямеччыне, Румыніі, Амэрыканскіх Штатах і інш.

Некаторыя выбухі каштавалі жыцьцё дзесяткам забітых і раненых! Рыхтуюцца шчыра да падпісаньня „трактату вечнага міру"!..

### Чаму павадыр эльзаскіх аўтанамістаў не папаў пад амністыю.

Прэзыдэнт Францускай рэспублікі падпісаў ужо дэкрэт, які дае амністыю 3 эльзаскім аўтанамістам, засуджаным на Кальмарскім працэсе. Пад амністыю, аднак-жа, не папаў галоўны павадыр усяго руху — д-р Рыклін, з-за якога найбольш спрачалася левіца. Але быццам не папаў толькі таму, што сам падаў касацыю (скаргу) на прысуд Кальмарскага суду.

# Рэгіяналізм.

Рэгіяналізм—гэта спосаб дэнацыяналізацыі нацыянальных меншасьцяў. Вось як коратка можна азначыць гэты новы кірунак, аб якім з вялікім захапленьнем пішуць санатары ў сваіх газэтак.

Да нас, у Зах. Бел., ён таксама лезе сьляпцом, думаючы знайсьці падатны грунт.

Першым чынам рэгіяналісты хочуць стварыць ілюзіі (пустыя выабражэньні) ў часткі беларускай інтэлігенцыі (ў родзе „спадара") што трэба толькі папрасіць і ўсё будзе дана, каб гэтым зрабіць іх пасыўнымі. За пасыўнасьцю інтэлігенцыі, думаюць рэгіяналісты, зробіцца пасыўны да сваіх вымаганьняў народ і адкажацца ад тых сотняў родных школ, на якія падаў тысячы дэкляраацыяў,— калі даць яму дзесятак утраквістычных і пару „беларускіх" школ.

Гэтая першая махінацыя азначае шаг назад, але другая ўжо шаг наперад.

Рэгіяналісты, як вышэй сказана, разьлічваючы на пасыўнасьць беларускіх працоўных мас, прыгатаўляюць моцнае наступленьне спалянізаваных кулакоў і дробнага мяшчанства, абшарнікаў, польскую інтэлігенцыю, шавіністычную моладзь і г. д. Гэтую „пярэстую" масу стараюцца арганізаваць і даць ім ідэалёгічнае выхаваньне. Для арганізацыі іх склікаюцца канфэрэнцыі (Наваградак), дзе пастанаўляюць закладаць акружныя „зажонды" і „кола".

„Ідэолёгію" ім даюць з аднаго боку, кажучы, што „шчэп бялорускі" ня мае ні культуры, ні мовы, што гэта цёмная „барбажыньская маса".

Яскравым доказам гэтага ёсьць артыкул у віленскім манархістычным „Слове", напісаны пад уплывам разважаньняў над прыказкаю „Ня дай Бог сьвіньні рог, а мужыку панства". Тут цынічна даказваецца немагчымасьць і сьмешнасьць імкненьня нашага гаротнага селяніна да лепшага жыцьця, да ўлады, якая дала-б яму яго варштат працы— зямлю і асьвету, кажучы, што мужык павінен быць на век мужыком.

З другога боку—паказаць веліч і значэньне польскае культуры і мовы, каб яе прышчапляць „барбажынцам". З гэтай мэтай арганізоўваюцца лекцыі, рэфэраты, а навет рэгіянальныя ўнівэрсытэты, як гэта мела мейсца ў Троках каля Вільні.

Вось, як робіцца аружжа, якое пускаецца ў ход, каб зьнішчыць нацыянальныя імкненьні народу. Вось, як буржуазія „вырашае" нацыянальнае пытаньне.

Але, ня туды ты, мой дурненьні Якімка заехаў, — скажам ім славамі Паўлінкі — заедзеш гэтак у нерат, што ні ўзад, ні ўперад.

Сьвядомасьць беларускіх працоўных мас дасьць належны адпор.

У адказ на наступленьне на нашу культуру-працу, здабытую ідучы да вызваленьня, на нашу мову, на якой мы пяём песьні вечнага прыгону і перамогі,—працоўнае сялянства масава ўступіць у сябры Т-ва Бел. Школы, заложыць сотні новых гурткоў, падыме працу там, дзе слаба яна ідзе, пашле сваіх дзяцей у родныя гімназіі, для падгатоўкі новых барацьбітаў.

Выгадуе кадры маладых здаровых культурных і грамадзкіх змагароў, якія дадуць належны адпор новаму наступленьню.

І гэтым мы пераможам.

# Наша хроніка.

**З Беларускага Дабрадзейнага Т-ва.** Нас інфармуюць, што Беларуск. Дабрадзейнае Т-ва, якое пераняла ўсе функцыі і абавязкі К-ту Помачы Ахвярам Вайны і ў гэтым 19²⁸/₂₉ школьным годзе пастараецца даваць стыпэндыі і паўстыпэндыі для добрых і здольных незаможных вучняў Віленскай Беларускай Гімназіі.

**Першы арганізацыйны Акружны З'езд Т-ва Беларуск. Школы ў Сьвіслачы (Ваўкавыск. пав.).** У нядзелю 22-га ліпня адбыўся Акружны З'езд Т-ва Беларуск. Школы ў Сьвіслачы, прадстаўніком на які быў дэлегаваны ад Галоўнай Управы Т-ва Беларуск. Школы гр. К. Крук.

На зьездзе, апрача гасьцей, было 35 сяброў, з двох паветаў: Ваўкавыскага і Бельскага.

З'езд прайшоў пры бадзерным настроі і закончыўся пяяньнем „Ад веку мы спалі"...

Падрабязную справаздачу аб з'ездзе дамо ў адным з наступных нумароў, а тут абмяжуемся падачай рэзалюцыі, прынятай на з'ездзе і складу выбранай Акружной Управы.

**Рэзалюцыя:** 1) „Акружны З'езд Т-ва Беларускае Школы ў Сьвіслачы рашуча пратэстуе проці няпрыхільных адносіны да працы гурткоў Т-ва з боку адміністрацыі, якая сыстэматычна ўтрудняе культурна-асьветную працу Т-ва Беларуск. Школы.

2) З'езд дамагаецца адчыненьня беларускіх школ, згодна з зложанымі дэклярацыямі.

3) З'езд дамагаецца, каб існуючыя беларускія гімназіі субсідыяваліся дзяржавай.

4) З'езд дамагаеццаа адчыненьня беларускай вучыцельскай сэмінарыі і вучыцельскіх курсаў на кошт дзяржавы.

5) З'езд пратэстуе проці незацьверджаньня „павятовым выдзялам" у Ваўкавыску 300 зл., выасыгнованых Сьвіслацкай местачковай радай на культурныя мэты Сьвіслацкага гуртка Т-ва Беларуск. Школы.

6) З'езд дамагаецца як найхутчэйшага звароту будынку, апячатанага ў свой час паліцыяй, які быў прызначаны на бібліятэку-чытальню Сьвіслацкага гуртка Т-ва Беларуск. Шк.

7) З'езд выражае ганьбу „стражы агнёвай" ў Сьвіслачы, якая не дае салі для спэктакляў Т-ва Бел. Школы і гэтым самым тамуе беларускую культурную працу".

**Склад Акруж. Управы.** Гр. Качаноўскі — старшыня, гр. Астапчык — сэкрэтар, сябры гр. гр. Сахараў, Варановіч і Акудовіч; заступнікі—гр. гр. Балван, Калюта і Шарык.

**Наглядная рада.** Гр. Кандрацюк Надзея, гр. Трахімік і Яяушкевіч.

**Новая шпіёнская „афэра" ў Віленшчыне.** Варшаўскі санацыйны „Głos Prawdy" падае ў апошнім сваім нумары (№ 201) вестку аб выкрыцьці новай вялізарнай шпікоўскай арганізацыі, на карысьць Радаў, у Віленскім павеце.

У сувязі з гэтым надовячы арыштавана колькінаццаць чалавек, на чале з правадыром арганізацыі Чарговым.

З іншых арыштаваных газэта выменіла нейкага Сымона Маяка, быццам „завадовага" (прафэсыянальнага) пераводчыка праз граніцу. Пры арыштаваных быццам знойдзена многа вельмі важных і абцяжаючых дакумантаў, і быццам некатарыя з іх, а разам і правадыр Чаргоў, узятыя „ў кшыжовы огень пытань", прызналіся да віны і далі рад „zadawalających zeznań".

Што гэта за „кшыжовы огень пытань"— добра ведае хіба кожны беларус?

**Ізноў шпікі.** Варшаўская прэса (Rzeczplita 209) падае аб арыштаваньні на радава-польскім паграніччы, у раёне Хаценчыцаў, 2 мужчынаў, у рукавах якіх быццам былі зашыты тайныя інструкцыі і абежнікі (акольнікі) КПЗБ і матэр'ялы, улічаючыя іх у шпікоўстве.

**Забарона паштовага дэбіту (перасылкі).** Міністэрства ўнутраных спраў паведаміла адносныя адміністрацыйныя ўлады ў Вільні аб адабраньні паштовага дэбіту ад наступных часапісяў:

1) „Впэрэд"—украінская часапісь, выходзячая ў Ужгарадзе.
2) „Дэр Штраль"— жыдоўская часапісь, выходзіць у Цярнёўцах.
3) „Rygos Balsas"—літоўская час., выходзіць у Рызе.
4) „Рудэ Право" (Чырвонае Права)—чэшская час., выходзіць у Празе.
5) „Беларуская Вёска" —бел. час., выходзіць у Менску.
6) „Гадоар" — у старажыдоўскай мове (жыд), выходзіць у Новым-Ёрку.
7) „Акцябр"—жыд., выходзіць у Менску.
8) „Тэвынэ"—літ. выходзіць у Новы-Ерк.

**Арыштаваньне бальшавіцкіх „купцоў".** Як падае „Rzplita" № 211, на радавым паграніччы арыштавана за нелегальны пераход граніцы (з Польшчы) тры бальшавіцкія купцы, аб якіх быццам усталена, што яны зьяўляюцца высланцамі Менскага Г. П. У.

**Зноў бандытызм.** Як падае „Słowo" з 24-VII г. г., апошнімі днямі ў Сухоцкай-Волі (Палесьсе) азброеная банда з некалькіх „wyrostków" напала ўночы на мяйсцовы паштовы ўрад.

Выламаўшы дзьверы і стэрорызаваўшы жыўшую там кіраўнічку, бандыты абабралі касу (больш 1000 злотых) і прапалі ў нявядамым кірунку.

Пагоня паліцыі не дала ніякага рэзультату.

**Арышт дэфраўданта.** Апошнімі днямі ў Крулеўшчыне арыштаваны касір польскай жалезнай дарогі нейкі Павал Кукель, які „дэфраўдаваў" грошы. Дэфраўдацыя была вялікіх разьмераў.

**Нешчасьлівая знаходка.** Апошнімі днямі селянін вёскі Мажэйкі, Нікіфар Кашэйка, Пастаўскага павету, знайшоў на полі бомбу. Спаткаўшыся з сваім суседам, Пятром Дзіека, Кашэйка хацеў яго пастрашыць і кінуў бомбу на блізкі камень. Бомба разарвалася і забіла яго, а Дзіека цяжка параніла ў бок, грудзі і галаву.

Трагічныя нашы „Крэсы", у якіх і пасьля доўгага часу па вайне, вайна ўсё яшчэ зьбірае свае ахвяры.

**Канфіската... „Dziennika Wileńskiego".** 22 г. м. Гродзкае Староства ў Вільні сканфіскавала наклад „Dziennika Wileńskiego" за зьмяшчэньне заметкі аб выкрыцьці радавай шпікоўскай арганізацыі.

Адказнаму рэдактару „пагражае"(?) да 5-ці гадоў цяжкага вастрогу.

Але няма ні каплі сумліву ў тым, што гэтае „пагражае" ніколі ня зьдзейсьніцца. Вось, каб так было з беларускім рэдактарам— то „co innego".

**Забастоўка пекароў у Вільні.** Надовячы выбухла забастоўка пекарскіх работнікаў. Бастуючыя дамагаюцца 20 прац. падбаўкі. („K. W." 165).

**Лік безработных Віленшчыны.** Па апошніх статыстычных даных, у Віленшчыне знаходзіцца 3.594 безработных, з чаго на Вільню прыпадае 3 395 чалавек.

**Перастрэлка з кантрабандзістамі.** Надовячы ўночы на польска-літоўскім паграніччы, у раёне Піліпава, завязана перастрэлка паміж йдучымі з Літвы кантрабандзістамі і польскай пагранічнай стражай. Перастрэлка трывала каля 10-ці мінют, пасьля чаго кантрабандзісты адступілі за літоўскую граніцу.

# З Т-ва Бел. Школы.

### Праца Гурткоў Т-ва Белар. Школы.

× У нядзелю 15 ліпня г. г. Гурток Т-ва Бел. Шк. ў м-ку Казлоўшчыне, Слонімскага пав. наладзіў спэктакль-вечарыну. Адыграна была камэдыя Ф. Аляхновіча ў 4-актах — „Шчасьлівы муж".

Чысты даход, у суме 84 зл., пойдзе на культурна-асьветныя мэты Т-ва Бел. Школы.

× 7. VII. 28 г. Гуртком Т-ва Бел. Шк. ў в. Пяшчаніікі, Беластоцкага павету быў пастаўлены спэктакль. Адыгралі наступныя камэдыі: „Боты" і „Мікітаў лапаць". Глядзельнікаў была поўная саля і ўсе былі здаволеныя.

Чысты даход, у суме 39 зл. 15 гр., пойдзе часткова на патрэбы драматычнай сэкцыі і частка на іншыя патрэбы Гуртка.

# КАРЭСПАНДЭНЦЫ.

### Сьвята працоўных.

(М-ка Трабы, Валожынскага пав.).

У дзень 1-га мая, ня гледзячы на пільнае сачэньне паліцыі, па ўсяму мястэчку былі разьвешаныя чырвоныя камуністычныя сьцягі ў ліку 12-ці, з надпісамі. Пасьля таго, як паліцыя зьняла сьцягі, адбыліся арышты пераважна маладых хлапцоў. Аднак, пасьля „збадання" ўсіх выпушчана на волю.

**Трабскі.**

### Хварэюць на паноў.

(В. Іванкавічы, Баранавіцкага пав.).

Гуртком Т-ва Бел. Шк. у нашай вёсцы быў абвешчаны спэктакль на 16. IV. 28 г. Калі пачула аб гэтым нашая „шляхта" (тыя самыя сярмяжнікі, беззямельнікі, што і мы, але лічаць сябе за паноў), дык кідала працу і хадзіла страшыць сялян з суседніх вёсак, каб ня йшлі на спэктакль, бо ўсіх, хто там будзе, арыштуюць і пажануць у вастрог. Але людзі іх не паслухалі і цэлымі грамадамі прываліл на нашую вечарыну.

Чакайце „шляхтуны"! Ці гэтая „хвароба на паноў" ня вылязе вам бокам?

**Будзільнік.**

### Усё за нашыя грошы.

(в. В.-Падлесьсе, Ляхав. гм., Баранав. пав.).

З нашай вёскі служыў у Ляхавіцкай школе адзін селянін сторажам. З работай спраўляўся вельмі добра. Але кіраўнік гэтай школы ўзяў купіў карову і, нямаючы служанкі, ня ведаў, як яе даглядаць. Тады ён звольніў стоража на летні час і на яго мейсца за нашыя гмінныя грошы наняў бабу ні-бы то на старажыху, а фактычна сабе за служанку. А былы сторож, які ў працягу цэлага школьнага году мусіў цяжка працаваць і якому цяпер належаў адпачынак, застаўся бяз хлеба, а за яго грошы вучыцель наняў служанку.

Радныя беларусы павінны ўзяцца за гэтую справу і не пазволіць, каб народныя грошы йшлі на панскіх служанак.

**Грамадзянін.**

### „Дэкарацыі" Браслаўскага і Дзісьненскага паветаў.

На мінулым тыдні ў мястэчках: Лужкі, Германовічы, Шаркаўшчына і некалькіх вёсках на тэлеграфных слупох былі вывешаныя чырвоныя сьцягі з рознымі антыдзяржаўнымі надпісамі. Калі паліцыя паздымала сьцягі, адбыліся ў многіх мясцох арышты.

**Горкі.**

### Круцельства.

(В. Лушнёва, Баранавіцкага пав.).

Дзякуючы стараньням некалькіх хлапцоў і па ініцыятыве нашага раднага, на падставе існуючых польскіх законаў аб асьвеце, удалося злажыць дэклярацыі на беларускую урадовую школу ў ліку 57 штук. Калі падалі іх інспэктару, у хуткім часе прыйшоў адказ, што „праектуецца ў верасьні 1928 г. адчыніць" доўга чаканую беларускую школу.

Аж сталася зусім іначай. Вось апошнімі днямі атрымалі паведамленьне... адмоўнае, матывам якога ёсьць быццам тое, што школьны вокруг ня ў нашай вёсцы, а ў Зьвераўшчыне, за 3 кіл.

Ну, ці-не ня круцельства гэта?

Мы, сяляне в. Лушкёва, „абяцаны" праект адкрыцьця вышэй азначанай школы лічым ні-больш-ні-менш як выбарнай абяцанкай. Але дарма... Ня гледзячы на гэты падыход, мы здалелі зарыентавацца і аддаць галасы за фактычных абаронцаў, якія і памогуць нам у змаганьні за родную школу.

**Збдудзіўшы.**

### Выступайма з ППС.

(В. Гарадзеча, Баранавіцкага пав.).

Быў я ў партыі, якая бараніла, бароніць і будзе бараніць нашымі шкурамі паноў абшарнікаў і капіталістаў. Партыяй гэтай ёсьць „Польская Партыя Сацыялістычна", але так завецца яна толькі дзеля таго, каб „пускаць дым у вочы" працоўным; запраўды ж гэта выглядае гэдак: „Польскіх Паноў Слугі". А чаму яны гэтак завуцца, дык гэта кожнаму сьвядомаму рабочаму і селяніну ведама. Мы, сяляне, патрабуем зямлі бяз выкупу, зьмяньшэньня падаткаў і пераносу іх на абшарнікаў, хочам школы на роднай мове і г. д., рабочыя хочуць 8-мігадзіннага дня працы, забясьпечаньня свайго жыцьця на выпадак нездольнасьці да працы і г. д. Працоўныя гэтага патрабуюць, бо гэтага патрабуе жыцьцё чалавека. І што-ж, прыйшлі выбары. Пачалі галасаваць. І, ня гледзячы на шалёную агітацыю „адзінкі", за якую узяліся ксяндзы, страшачы бурамі і пярунамі, нашыя сяляне галасавалі за „левых" (як яны сябе называлі) „пэпэсаў", „вызваленцаў" і г. д. Кончыліся нарэшце выбары. У Сойме большасьць „левых"; думаем, што разам з беларускімі сялянска-работніцкімі пасламі (што такія лісты былі даведаліся пасьля) будуць падтрымліваць нашыя жаданьні. Але яны, гэтыя „левыя", ня толькі абманулі нас, але павыдавалі суду сялянска-работніцкіх паслоў!

Дык ці-ж ня лёкаі буржуйскія? Ці гэта не фурманы Радзівіла?

Сяляне і работнікі! Няхай гэта будзе для нас добраю навукаю. Выступайма з гэтых лякайскіх партыяў, а гуртуймася каля сваіх сялянска-работніцкіх паслоў, якія ўваходзяць у „Беларускі Сялянска-Раб. Клюб".

**Апомніўшыся.**

### O, tempora! O, mores! *).

(Новы-Пагост, Браслаўскага пав.).

У суботу 7. VII—28 г. у Чарневічах (10 вёрст ад Лужак) польскі капраль забіў з рэвальвэра працаўніка Сымона Плоскага з в. Дзянісы за тое, што нібы ён сказаў, што дрэнна жывецца беларусам пад Польшчай.

Сумнае і абураючае ўражаньне ахапіла ўсіх, хто быў сьведкаю гэтага здарэньня і хто пачуў аб ім.

Забітаму 33 гады, ён ў Чарневічах шукаў працы, а знайшоў сьмерць.

Вечная памяць нявіннай ахвяры!

**Горкі.**

*) О, часы! О, звычаі!

# Пісьмо у Рэдакцыю.

*Паважаны Грамадзянін Рэдактар!*

Прашу не адмовіць надрукаваць у Вашай газэце наступнае.

Добра ведамы беларускаму грамадзянству сваімі вельмі варожымі адносінамі да беларускага адраджэнскага руху, абліваючы намыямі беларускіх культурных і палітычных дзеячаў „Dziennik Wileński" не перастае цікавіцца і маей асобай.

Ня здолеўшы зрабіць з мяне камуністага і камісара, аб чым ён пісаў ад пачатку 1927 года, цяпер ён імкнецца зрабіць з мяне вар'ята, бо ж запраўды—прыпісаць тую хлусьню, якую мне прыпісвае „Dziennik Wileński" ў № 158 ад 14 ліпня г. г. можна толькі вар'яту, або сам пішучы павінен быць вар'ятам. У вышэйпрыведзеным нумары „Dziennik Wileński" піша, быццам я сьцьвярджаю (twierdzi), што Міністэрства Рэлігіі і Асьветы запрапанавала мне пасаду беларускага праваслаўнага япіскапа.

У сувязі з вышэйпададзеным і знаходзячыся ў здаровым розуме заяўляю.

1. Праваслаўныя япіскапы ў Польшчы пастаўляюцца ў япіскапскі сан, згодна з § 10 часовых правілаў ад 30 сьнежня 1920 года, на падставе адпаведнай пастановы Сабора Праваслаўных Япіскапаў у Польшчы.

2. Япіскапы пастаўляюцца з манахаў. я-жа манахам не зьяўляюся і, як звычайны сьвяшчэньнік, належу да белага духавенства.

3. Да япіскапскага сану ня толькі ня імкнуся дзеля таго, што шчасьліва жыву з сваей жонкай і ня маю падставы чакаць не сьмерці, а і дзеля таго, што на царкоўным, эканамічным і культурным груньце магу і ў меру сваіх сілаў буду шчыра працаваць на карысьць роднага мне Беларускага Народу ў тым палажэньні, у якім знаходжуся цяпер.

4. Ніякіх зносінаў з Міністэр. Рэлігіі і Асьветы ані ў справе Япіскапства, ані ў іншых справах ня меў і ня маю — і нікому аб гэтым нічога ня „цьвердзіў".

Якой-жа мэты сіліцца дасягнуць „Dz. Wil.", пішучы аба мне сваю хлусьню? — Мэты—чыста дэфэнзыўныя — зрабіць на мяне данос:

а) Духоўным уладам—Мітрапаліту і Япіскапам — быццам я імкнуся заняць гдзе-небудзь з іх месца.

б) Міністэрству Рэлігіі і Асьветы, быццам я прыпісваю яму тое, чаго ніколі ня было.

в) Скампрамітаваць мяне сярод грамадзянства.

Апошняе мэты „Dz. Wil." дасягнуў-бы тады, калі-б ён мяне хваліў,—а калі лаець— дык толькі выклікае пашану да таго, каго лаець.

Не жадаючы мець ніякіх зносінаў з „Dz. Wil.", я змушаны прасіць надрукаваць маё пісьмо ў Вашай паважанай газэце, зазначаючы, што гэты мой адказ зьўляецца адказам як „Dz. Wil.", так і тым газэтам, якія гэтую брахню яго ў сябе перадрукавалі, або перадрукуюць, а так-жа што ў будучыне на ілжу „Dz. Wil." і надобных да яго адказываць ня буду.

**Сьвяшчэньнік А. Коўш.**

15./VII. 1928 г.
Вільня, вул. Летняя 7.

# Ад Віленскае Беларускае Гімназіі.

На падставе атрыманых распараджэньняў, прыймо ў Гімназію новых вучняў можа адбыцца ўвосені толькі з дазволу Куратарыуму. Усе просьбы адрэсуюцца на імя Куратарыуму Віленскага Школьнага Вокругу, але прысылаць іх, разам з дакумэнтамі, трэба **ў Дырэкцыю Гімназіі і не пазьней 10 жніўня г. г.**

Хто перарос вымаганую норму, той ня можа быць прынятым у Гімназію. У I кл. прыймаюцца ад 9½ да 12 гадоў, у II ад 10½ да 13 гадоў, у III ад 11½ да 14 г. і г. д.

У інтэрнат пры Гімназіі будуць прыймацца толькі хлапцы **малодшых клясаў** (I—IV кл.) з платаю за ўтрыманьне ад 50 да 60 зл. у месяц. пры сваім адзеньні і бялізьне. (Гэта не адносіцца да стыпэндыятаў).

За падробнымі спраўкамі зварочвацца ў Канцэлярыю Гімназіі.

**Дырэкцыя.**

# Ад Радашкоўскае Белар. Гімназіі.

Даводзіцца да агульнага ведама, што прыймо вучняў у Радашкаўскую Гімназію адчынена ў-ва ўсе 8 клясаў.

На падставе атрыманых загадаў, да ўступных экзаменаў жадаючыя будуць дапушчацца толькі з дазволу Куратарыуму Віленскага Школьнага Вокругу.

Усе просьбы аб дапушчэньні да экзаменаў ці залічэньні вучнем павінны адрэсавацца на імя Куратарыуму і прысылацца разам з дакумантамі (мэтрыка і аб папярэдняй адукацыі) ў Дырэкцыю Гімназіі не пазьней 10 жніўня г. г.

Адрэс: m. Radoszkowicze, pow. Mołodeczno.

**Дырэкцыя.**



# Абвестка.

## Згубленыя дакумэнты

на імя Мікалая Шылы: Вайсковая кніжка, выданая Віленскім P. K. U., пасьведчаньне Бакштанскай гміны, Буцлаўскае гімназіі, Барунскае сэмінарыі і інш.—уневажняюцца.

Рэдактар-Выдавец: Ал. Клаўсуць.

Друкарня Я. Левіна, Вільня, Нямецкая 22.